# Гасцей прымаем сардэчна

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, ён расказаў, што ў сталіцы забяспечанасць інтэрнатамі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, калі ўвядуць у эксплуатацыю ўсе запланаваныя аб'екты, складзе больш за 93 %, а па ўсёй краіне плануецца выйсці на паказчык у больш за 96 %. «Гэта цуд», — пракаментаваў такую інфармацыю Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым міністр звярнуў увагу, што ў асобных універсітэтах сітуацыя з інтэрнатамі адрозніваецца, аднак праблема вырашаецца. «Усё гэта мы будзем рабіць, будзем распрацоўваць месцы ў інтэрнаце і іншае, але нам трэба падумаць аб замацаванні студэнтаў», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што вялікія грашовыя сродкі выдзяляюцца на навучанне і стварэнне інфраструктуры для студэнтаў, тыя ж інтэрнаты, аднак пасля вучобы некаторыя студэнты адмаўляюцца працаваць па атрыманай прафесіі. Кіраўнік дзяржавы заклікаў вывучыць гэтае пытанне, тым больш што ў нашай краіне — таксама як і ў іншых — плануецца неабходная колькасць урачоў, настаўнікаў і іншых спецыялістаў. А сёння сітуацыя такая, што на вытворчасцях, у бальніцах і школах работнікаў не хапае.

Калі беларускаму лідару паказвалі сталовую і кухню, ён звярнуў увагу на раздзельны збор смецця і яго перапрацоўку і даручыў узяць гэтае пытанне на кантроль.

Прэзідэнт азнаёміўся з умовамі пражывання ўдзельнікаў Гульняў у інтэрнаце Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, агледзеў штабны пакой дэлегацыі, медыцынскі блок.

Пасля гэтага кіраўнік дзяржавы пагутарыў з журналістамі.

### Гатоўнасць спартыўных аб'ектаў — практычна 100 %

Беларускі лідар адзначыў важнасць Вёскі спартсменаў — месца, дзе людзі будуць пражываць і харчавацца. «Вядома, гэта вельмі важна, але аснова асноў — гэта ўсё ж такі спартыўныя аб'екты. Людзі прыязджаюць сюды не толькі жыць, глядзець і паесці. Яны павінны паказваць вынікі на спартыўных пляцоўках — іх у нас 15, — сказаў ён. — Як мне дакладваюць, яны на 99,9 працэнта гатовыя.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з тым, што ўсё створанае для Еўрапейскіх гульняў павінна выкарыстоўвацца і ў будучыні.

Мэру Мінска Анатолю Сіваку было даручана пракантраляваць гэты працэс. «Ніякага тут крадзяжу і расцягвання не будзе. Усё павінна быць па-гаспадарску. Мы людзі не бедныя, можна сказаць, але і не багатыя, каб раскідвацца дабром», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Замахнёмся на самыя вялікія турніры?

Яшчэ адно пытанне на тэму спорту: «Ці будзе Беларусь у выпадку паспяховага правядзення II Еўрапейскіх гульняў прапаноўваць сваю кандыдатуру на правядзенне такіх турніраў, як чэмпіянат Еўропы ці свету па футболе, Алімпійскія гульні?»

«З вялікім задавальненнем. Ёсць адзін мінус — у нас няма яшчэ аднаго нацыянальнага стадыёна для таго, каб праводзіць чэмпіянат Еўропы па футболе», — заўважыў Прэзідэнт.

Падчас нядаўняга візіту беларускага лідара ў КНР Сі Цзіньпін прэзентаваў яму макеты двух буйных дарагіх аб'ектаў — басейна сусветнага ўзроўню (для правядзення этапаў чэмпіянату свету) і нацыянальнага стадыёна, якія Кітай мае намер узвесці ў нашай краіне. «Я прасіў Сі, Прэзідэнта Кітая, каб ён пабудаваў з такім кітайскім каларытам, каб вы і вашы дзеці прыходзілі і разумелі, што гэта падарунак кітайскага народа беларускаму. Мы гэта ў найбліжэйшыя два гады зробім і тады можам замахнуцца на што заўгодна», — пацвердзіў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што Беларусь несумненна правядзе II Еўрапейскія гульні на высокім узроўні. Безумоўна, па багацці арганізацыі Еўрапейскіх гульняў Беларусі не угнацца за Азербайджанам. «Але мы павінны ўкласці туды душу», — падкрэсліў Прэзідэнт і дадаў, што нашы спаборніцтвы павінны быць самымі душэўнымі, а народ павінен імі жыць.

### Пра нафту: суму шкоды агучым пазней

Яшчэ беларускага лідара папрасілі даць ацэнку сітуацыі з забруджанай нафтай з Расіі.

«Мая прынцыповая ацэнка вельмі негатыўная, — падкрэсліў беларускі лідар. — Расхлябанасць і разбоўтанасць на тэрыторыі Расіі — а гэта не адна тысяча кіламетраў, — велізарная труба была забруджана гэтай атрутнай нафтай».

Што датычыцца канкрэтнай сумы шкоды, яна пакуль невядомая, але відавочна, што будзе вельмі вялікая. «Зараз мы ацэньваем шкоду. Звычайна на месяц-паўтара мы заводы спыняем напераменку і пачынаем іх кожны год чысціць. Рэвізію правядзём, і ўжо канчатковая будзе ацэнка», — адзначыў ён.

«З Пуціным пытанне кампенсацыі мы не абмяркоўвалі. Ён разумее, што трэба шкоду кампенсаваць, сам назваў гэта велізарнай іміджавай стратай для Расіі. А ўявіце, што ў цэнтры гэтай шкоды ляжыць Беларусь», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь не збіраецца выкарыстоўваць гэтую сітуацыю і ўвязваць пытанне кампенсацыі з урэгуляваннем сітуацыі вакол падатковага манеўру Расіі і яго наступстваў, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта не мае ніякага дачынення да падатковага манеўру. Адбылася бяда. Спецыяльна гэта зроблена, наўмысна? Няхай яны разбіраюцца ў сябе самі. На нашы нафтаперапрацоўчыя заводы, як мне дакладваюць, паступае ўжо чыстая нафта. Частку атрутнай нафты мы адпампавалі ў свае сховішчы», — дадаў ён.

### Звычайная барацьба з карупцыяй

Яшчэ падчас наведвання Студэнцкай вёскі беларускі лідар пракаментаваў затрыманне былога намесніка дзяржсакратара Савета бяспекі Андрэя Уцюрына.

Ён падкрэсліў, што ўсе высокія службовыя асобы аднолькава да яго набліжаны і ім вядома, што з іх будзе двайное, а то і трайное патрабаванне ў выпадку здзяйснення злачынстваў.

Адносна самога Уцюрына, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, калі б ён быў у яго па-за падазрэннямі, ён бы да гэтага часу працаваў начальнікам Службы бяспекі.

Некаторыя звязваюць арышт Андрэя Уцюрына і адхіленне Міхаіла Бабіча ад пасады пасла Расіі ў Беларусі. Аднак, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэты чалавек трапіў у поле зроку праваахоўнікаў яшчэ да пераходу ў Савет бяспекі. Таму, дадаў ён, гэта не мае ніякага дачынення да таго, што Уцюрын нібыта быў ледзь не агентам пасла Расіі.

Гэты чалавек знаходзіўся пад кантролем спецслужбаў каля паўтара-двух гадоў — фактаў аб супрацьпраўнай дзейнасці было нямала. Аляксандр Лукашэнка расказаў аб сваім жалезабетонным патрабаванні: чалавек, які мае «індульгенцыю» ад Прэзідэнта, павінен быць затрыманы толькі пры наяўнасці жалезабетонных доказаў. Уцюрына ўзялі з доказамі злачынства: 150 тысяч долараў яму чарговы раз прывезлі расіяне.

Паводле слоў беларускага лідара, затрыманы валодаў шматлікімі станоўчымі якасцямі, нядрэнна служыў, але ён усё перакрэсліў сваім учынкам. «Тут абсалютна няма нічога надзвычайнага, звычайная барацьба з карупцыяй», — дадаў ён.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# У ПАЗІТЫЎНЫМ НАПРАМКУ

## Беларусь станоўча ацэньвае ўклад Германіі і яе пасла асабіста ў нармалізацыю адносін з ЕС

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом ФРГ у Беларусі Петэрам Дэтмарам, які завяршае дыпламатычную місію ў нашай краіне.**

Паводле слоў Прэзідэнта, за перыяд місіі Петэра Дэтмара ў якасці пасла адбыліся значныя змены ва ўзаемаадносінах не толькі Беларусі з Германіяй, што выяўляецца ў тавараабароце, які вырас за гэты час амаль на трэць. Гэты паказчык за 2018 год склаў больш за 3,3 млрд долараў. Кіраўнік дзяржавы назваў такі тавараабарот велізарным.

«Але акрамя тавараабароту ў нас пацяплелі адносіны ў цэлым з Еўрапейскім саюзам, — канстатаваў беларускі лідар. — У ЕС Германія — вядучая краіна, таму мы вельмі станоўча ацэньваем не толькі ўклад Германіі, але і ваш асабісты ў нармалізацыю адносін Беларусі з Еўрапейскім саюзам».

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу, што пэўныя пытанні ёсць нават у выпадку станоўчага развіцця адносін. «Вазьміце вельмі прасунутыя, нашы дружалюбныя, брацкія адносіны з Расіяй — тым не менш маса пытанняў, якія трэба вырашаць. Таму і з Германіяй у нас — і з Еўрапейскім саюзам тым больш — ёсць нямала пытанняў, якія трэба вырашаць», — адзначыў Прэзідэнт і папрасіў Петэра Дэтмара адкрыта выказацца з нагоды тых ці іншых праблем.

У адказ Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ФРГ у Беларусі падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за аказаны давер на працягу ўсяго тэрміну дзейнасці ў нашай краіне. Ён пагадзіўся з тым, што апошнія чатыры гады адносіны паміж дзвюма краінамі развіваюцца вельмі дынамічна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### У ТЭМУ

#### Тысячы сустрэч, сардэчную цеплыню і гасціннасць

Па выніках сустрэчы з беларускім лідарам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ФРГ у Беларусі Петэр Дэтмар пагутарыў з журналістамі.

Ён зноў звярнуў увагу на тое, што за апошнія чатыры гады адносіны паміж Беларуссю і Германіяй у палітычнай, эканамічнай і культурнай сферах істотна палепшыліся. «І вось гэтая пазітыўная дынаміка магла паўстаць і ўзмацніцца толькі дзякуючы цеснаму ўзаемадзеянню з урадам Беларусі. Я спадзяюся, што ў найбліжэйшы час і ў будучыні гэтая дынаміка будзе і далей развівацца», — дадаў Петэр Дэтмар.

Таксама ён выказаўся з нагоды ўзаемадзеяння дзвюх дзяржаў у бізнес-сферы і адзначыў, што цікавасць германскага бізнесу да Беларусі расце. У пацвярджэнне сваіх слоў пасол расказаў пра найбліжэйшыя візіты дэлегацый з Германіі ў Беларусь.

Так, у сярэдзіне чэрвеня да нас прыбудзе зямельны міністр па пытаннях транспарту з Гамбурга. Таксама нашу краіну наведае кіраўніцтва Федэральнага саюза малога і сярэдняга бізнесу Германіі (ён аб'ядноўвае больш за 55 тысяч нямецкіх кампаній). У верасні да нас прыедзе дзяржаўны сакратар Федэральнага міністэрства эканомікі і энергетыкі Германіі. Безумоўна, усе гэтыя дэлегацыі будуць праводзіць у Беларусі перагаворы на ўзроўні міністраў, мецъ зносіны з партнёрамі.

Што датычыцца двухбаковых адносін паміж Беларуссю і Германіяй у цэлым, то Петэр Дэтмар адзначыў, што наша краіна да гэтага часу недастаткова прысутнічае ў свядомасці Еўропы і асобных краін — членаў ЕС. Больш за тое, Федэральны Прэзідэнт Германіі заяўляў, што настаў час паглядзець на Беларусь як суверэнную дзяржаву з уласным мінулым, сучасным і будучыняй. «Уласна, гэтым пасылам кіруецца ўрад Германіі, пасольства Германіі ў Беларусі ў развіцці адносін у самых розных сферах», — дадаў пасол.

Што ж павязе з сабой з Беларусі Петэр Дэтмар, калі скончыцца яго місія? «Калі пакінуць за дужкамі прыгажосць вашай краіны, то самае галоўнае, што мы — я і мая жонка — забяром, — гэта тысячы чалавечых сустрэч, сустрэч з людзьмі ў Беларусі, гэта сардэчная цеплыня, гасціннасць, шматлікія сяброўскія сувязі, якія тут паўсталі. Вось гэта ўсё мы забяром з сабой», — сказаў Петэр Дэтмар.

Знешняя палітыка

**Уладзімір МАКЕЙ:**

# «МЫ ПАВІННЫ ШУКАЦЬ ТОЕ, ШТО НАС АБ'ЯДНОЎВАЕ»

**Кіраўнік беларускага МЗС прымае ўдзел у саміце «Усходняга партнёрства» ў Бруселі**

**«Вельмі важна дасканала праанаалізаваць усе нашы дасягненні — а яны ёсць — і падумаць, дзе існуюць недахопы, зрабіць адпаведныя высновы, каб наступныя 10 гадоў мы дасягнулі шмат большага ў рамках развіцця ініцыятывы «Усходняга партнёрства», — сказаў міністр замежных спраў Беларусі журналістам перад самітам.**

Ён адзначыў, што Беларусь і далей будзе працягваць курс на развіццё адносін з Еўрапейскім саюзам і дабівацца падпісання Прыярытэтаў партнёрства. Паводле слоў міністра, «працэс гэты пакуль не па нашай віне прыпынены». «Я спадзяюся, што да канца года мы прасунемся і ў плане падпісання двух пагадненняў па аблягчэнні візавага рэжыму і па рэадмісіі. Мы маем намер гаварыць, што нам трэба працаваць над тым, каб заключыць асноўнае пагадненне аб супрацоўніцтве і партнёрстве з Еўрапейскім саюзам», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Па словах кіраўніка МЗС, пэўныя негатыўныя моманты заўсёды прысутнічаюць у інтэграцыйных і двухбаковых адносінах, але важна «не зацыклівацца на іх, а шукаць тое, што аб'ядноўвае і дапаможа вырашыць праблемы, выйсці на паступальнае развіццё».

«Мы заўсёды зыходзілі з таго, што павінны шукаць тое, што нас не раз'ядноўвае, а аб'ядноўвае. І на такой аснове трэба выбудоўваць нашы адносіны. Я лічу, што прыхільнасць да аб'яднальнага парадку дня дае заўсёды больш вынікаў для ўсіх суб'ектаў міжнароднага права, чым канфрантацыйная лінія», — канстатаваў Макей.

Адказваючы на пытанне, чаму ў Брусель не прыехаў Прэзідэнт, ён заўважыў: «Прыйдзе час, прыедзе і Прэзідэнт. Пакуль мы не можам казаць, што дасягнулі высокага ўзроўню ў развіцці нашых адносін з Еўрапейскім саюзам, захоўваюцца пэўныя абмежаванні». Міністр заўважыў, што нават удзел кіраўніка дзяржавы ў мерапрыемствах, прымеркаваных да 10-годдзя «Усходняга партнёрства" не даў бы стапрацэнтнай аддачы. «Візіт павінен быць максімальна выніковым, максімальна насычаным», — расказаў міністр.

У любым выпадку бягучыя сустрэчы важныя для ўсіх бакоў, падкрэсліў Макей.

Мерапрыемствы, прысвечанае 10-годдзю ініцыятывы добрасуседства, адбываецца гэтымі днямі ў Брусэлі. Узначальваюць пасяджэнне з боку Еўрапейскага саюза вярхоўны прадстаўнік ЕС, віцэ-прэзідэнт Федэрыка Магерыні і член Еўрапейскай камісіі Ёханес Хан. Акрамя кіраўнікоў МЗС краін — удзельніц «Усходняга партнёрства» (Беларусь, Украіна, Малдова, Арменія, Азербайджан, Грузія), на сустрэчы прысутнічаюць іх калегі з дзяржаў — членаў ЕС.

Сёння мерапрыемствы да 10-годдзя «Усходняга партнёрства» працягнуцца Канферэнцыяй высокага ўзроўню.

**Марыя ДАДАЛКА**, *г. Брусель.*